…ЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі Універсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ І ПРАФКОМАЎ ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 25 (547) | Субота, 10 верасня 1983 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап

## АБМЕРКАВАНА НА РЭКТАРАЦЕ

У мінулы панядзелак адбылося чарговае пасяджэнне рэктарата. На ім ішла дзелавая размова аб выкананні пастановы ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР і ВЦСПС «Аб узмацненні работы па ўмацаванню сацыялістычнай дысцыпліны працы». Па гэтаму пытанню выступілі 10 чалавек, якія ўнеслі канкрэтныя прапановы па далейшаму паляпшэнню арганізацыі працы, вучэбнага працэсу, умацаванню працоўнай, вучэбнай і выканаўчай дысцыпліны.

Заслухана інфармацыя члена штаба працоўных спраў ГДУ А. А. Косцікава аб выніках сельскагаспадарчых работ у падшэфным саўгасе «Рэчкі» Веткаўскага раёна і ўдзеле студэнтаў у нарыхтоўцы кармоў, а таксама аб задачах па арганізацыі і правядзенню ўборкі бульбы ў названай гаспадарцы, калгасах і саўгасах Петрыкаўскага і Жыткавіцкага раёнаў.

На рэктараце рагледжаны іншыя пытанні універсітэцкага жыцця і прыняты адпаведныя рашэнні.

# СТАРТ У НАВУКУ

## З пасвячэння першакурснікаў у студэнты

Кожны год прымае новае папаўненне Гомельскі дзяржаўны універсітэт. Па даўняй і добрай традыцыі першага верасня адбываецца ўрачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты.

З прыўзнятым настроем сабраліся яны каля першага корпуса. Светла і радасна на душы ва ўчарашніх абітурыентаў: з поспехам вытрыманы ўступныя экзамены, заваявана права насіць ганаровае званне савецкага студэнта.

Чуюцца гукі горна: «Слухайце, усе!». Пад урачысты марш уносяць сцяг ГДУ. Побач з ім — Памятны сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР за шматгадовы ўдзел у будаўніцтве і меліярацыі зямель, поспехі ў вучобе і грамадска-палітычным жыцці. І ў гэтым вялікі сэнс: глядзіце, першакурснікі, як дастойна неслі імя універсітэта вашы папярэднікі, раўняйцеся на іх дасягненні.

Слова прадастаўляецца прарэктару па вучэбнай рабоце, члену-карэспандэнту АН БССР Л. А. Шамяткову. Ён віншуе першакурснікаў з паступленнем у ГДУ, жадае ім поспехаў. А потым пад апладысменты прысутных уручае студэнцкія білеты тым, хто ўжо на ўступных экзаменах паказаў выдатныя веды.

Сённяшняе пакаленне савецкага студэнцтва нарадзілася і вырасла ў пасляваенныя гады. І гераічны час ведае толькі па кнігах і кінафільмах, расказах старэйшых. У сэрцах маладых — памяць і ўдзячнасць. І як сведчанне гэтай памяці — кветкі да Вечнага агню на плошчы Працы.

Ад імя новага папаўнення студэнцкай сям'і універсітэта выступіла першакурсніца гісторыка-філалагічнага факультэта Алена Воінава. Яна запэўніла выкладчыкаў, старэйшых таварышаў у тым, што першакурснікі з гонарам апраўдаюць званне савецкага студэнта, будуць працягваць і памнажаць выдатныя традыцыі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

...Палае сімвалічная «Чаша ведаў». Першакурснікі крочаць на сваю першую ў жыцці лекцыю. Іх мара здзейснілася. Наперадзе — цікавае і напружанае студэнцкае жыццё.

(Наш кар.).












### *Фотарэпартаж*

НА ЗДЫМКАХ: 1. Сцяг універсітэта нясе ветэран вайны і працы, кавалер ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дадэнт Г. С. Еўдакіменка. 2. «Чашу ведаў» запальвае ўдзельнік VIII Спартакіяды народаў СССР, майстар спорту СССР С. Кашко. 3. Прарэктар па вучэбнай рабоце член-карэспандэнт АН БССР Л. А. Шамяткоў уручае студэнцкія білеты медалістам, якія на першым жа экзамене пацвердзілі свае выдатныя веды. 4. Сімвалічны «Ключ ведаў» — у першакурсніцы гісторыка-філалагічнага факультэта А. Воінавай. 5. Звініць першы універсітэцкі званок.

Фота К. Дзмітэркі.

## ЗВАРОТ ДА СТУДЭНТАЎ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ АТРАДАЎ

З надыходам восені прыбаўляецца клопатаў у сельскіх працаўнікоў. Трэба своечасова і без страт убраць вырашчаны ўраджай. А ўборка бульбы, якую мы па праву называем другім хлебам, патрабуе вялікіх затрат, шмат рабочых рук. Таму кожнай восенню адпраўляюцца на дапамогу калгаснікам, рабочым саўгасаў навучэнцы тэхнікумаў, студэнты вышэйшых навучальных устаноў, рабочыя прадпрыемстваў.

Як і штогод, сёлета ў складзе сельскагаспадарчых атрадаў студэнты нашага універсітэта акажуць вялікую дапамогу ва ўборцы бульбы, у выкананні іншых сельскагаспадачых работ калгасам і саўгасам Гомельшчыны. Рэктарат, партком, камітэт камсамола, прафком, дэканаты факультэтаў ускладваюць на цябе, студэнт, вялікія надзеі і выказваюць упэўненасць у тое, што юнакі і дзяўчаты, прадстаўнікі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, будуць працаваць сумленна, па-ударнаму, сваёй самаадданай працай заслужаць шчырую удзячнасць сельскіх працаўнікоў, памножаць здабыткі байцоў зводнага студэнцкага будаўнічага атрада універсітэта, якія з поспехам завяршылі працоўны семестр —83.

У 15 гаспадарак Жыткавіцкага, 5— Петрыкаўскага і у падшэфны саўгас «Рэчкі» Веткаўскага раёна разам з выкладчыкамі выехала 1.100 студэнтаў універсітэта. Неабходна наладзіць сацыялістычнае спаборніцтва паміж сельскагаспадарчымі атрадамі пад дэвізам: «40-годдзю вызвалення г. Гомеля — дастойную сустрэчу!», шырока асвятляць яго ў выпусках «маланак» і «баявых лісткоў».

Ударная праца на бульбяных палетках, выхаваўчая работа сярод школьнікаў будуць улічвацца пры падвядзенні вынікаў на лепшую акадэмічную групу ГДУ.

За апошнія гады ва універсітэце накоплен багаты вопыт шэфскай дапамогі сельскім працаўнікам. Ваш абавязак паглыбіць і замацаваць дасягнутае новымі працоўнымі поспехамі.

РЭКТАРАТ, ПАРТКОМ, КАМІТЭТ ЛКСМБ,
ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.

## УМОВЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА АТРАДАЎ ГДУ НА СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧЫХ РАБОТАХ

Лічыць пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва на сельгасработах студэнцкую групу, якая:

— даб'ецца найбольшай выпрацоўкі на сельгасработах у працэнтым выражэнні на кожнага члена атрада пры высокай якасці работы і строгім захоўванні правіл тэхнікі бяспекі;

— пryме актыўны ўдзел у грамадскім жыцці пярвічных камсамольскіх арганізацый, выхаваўчай рабоце сярод школьнікаў, у агітацыйна-прапагандысцкай рабоце па мабілізацыі працоўных на паспяховае выкананне рашэнняў XXVI з'езда КПСС, задач, пастаўленых майскім, лістападаўскім (1982 г.) і чэрвеньскім (1983 г.) Пленумамі ЦК КПСС, на дастойную сустрэчу 40-годдзя з дня вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Агульныя вынікі спаборніцтва атрадаў будуць падведзены на падставе даведак аб вытворчай і грамадска-палітычнай рабоце, якія павінны быць засведчаны кіраўнікамі гаспадарак.

Атрад, які зойме 1-е месца, будзе ўзнагароджаны Ганаровай граматай рэктарата, парткома, камітэта камсамола і прафкома ГДУ і заахвочаны паездкай у сталіцу нашай рэспублікі — горад-герой Мінск.

Атрады якія зоймуць 2-е і 3-е месцы, будуць ўзнагароджаны граматай рэктарата, парткома, камітэта камсамола і прафкома універсітэта.

Студэнты, якія даб'юцца найвышэйшых паказчыкаў у грамадска-палітычнай рабоце, будуць лічыцца пераможцамі сацыялістычнага спаборніцтва па дастойнай сустрэчы 40-годдзя з дня вызвалення г. Гомеля ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і ўзнагароджаны граматамі рэктарата, парткома, камітэта ЛКСМБ і прафкома ГДУ.

КАМІТЭТ ЛКСМБ,
ПРАФКОМ.

## З МІТЫНГУ СТУДЭНЦКІХ БУДАЎНІЧЫХ АТРАДАЎ



# ДОБРЫ СТАРТ— ПАСПЯХОВЫ ФІНІШ

Юбілейным, 25-м па ліку быў сёлета працоўны семестр для Усесаюзнага студэнцкага будаўнічага атрада. Чвэрць стагоддзя раздзяляе першы цалінны дэсант выхаванцаў Маскоўскага універсітэта і тых, хто сёння трымаў летні працоўны экзамен-83.

У агульны летапіс слаўных спраў УСБА ўнісана шмат яркіх старонак і студэнтамі Гомельшчыны, нашай ВНУ. Юбілейны працоўны семестр азнаменаваны байцамі студэнцкіх атрадаў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта новымі здабыткамі, перамогамі. Аб гэтым яны рапартавалі на мінулым тыдні на мітынгу байцоў СБА, прысвечаным заканчэнню летняга семестра-83.

...Каля першага корпуса універсітэта — шарэнгі байцоў студэнцкіх атрадаў. Юнакі і дзяўчаты, прыкметна пасталеўшыя за лета, якія яшчэ ўчора ўдарна працавалі на розных аб'ектах вобласці, рэспублікі, на саўгасных і калгасных палетках, на транспарце, сабраліся на мітынг, каб рапартаваць парткому, камітэту камсамола ГДУ аб сваіх поспехах і дасягненнях. На мітынгу прысутнічае сакратар парткома універсітэта М. І. Старавойтаў, прадстаўнікі грамадскіх арганізацый ГДУ.

Урачыста праносяцца перад удзельнікамі мітынгу Сцяг камсамольскай арганізацыі універсітэта, памятны Сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР «За шматгадовы актыўны ўдзел у будаўніцтве і меліярацыі зямель, поспехі ў вучобе і грамадска-палітычным жыцці». Несці іх даверана выдатнікам вучобы Івану Афанасьеву і аднаму з лепшых байцоў студэнцкіх атрадаў Віктару Кузьмічу.

Са словамі прывітання да байцоў студэнцкіх атрадаў ГДУ звярнулася намеснік сакратара камітэта камсамола Анна Шалдукова.

Аб паспяховым выкананні прынятых на працоўны семестр-83 сацыялістычных абавязацельстваў рапартавалі на мітынгу байцы, камандзіры, камісары СБА. Не ўсё было так лёгка і проста, як здаецца на першы погляд. Сустракаліся цяжкасці, былі няўдачы. Але байцы знаходзілі і сілу, і ўменне, каб пераадольваць іх. Пра гэта гаварылі выступаўшыя на мітынгу баец СБА «Аэліта» Ніна Дабравольская, камісар атрада «Глобус» Генадзь Осіпаў, камандзір інтэрнацыянальнага атрада «Дружба-83» Дзмітрый Паўлавец.

Загадчыку кафедры рускай літаратуры Уладзіміру Мікалаевічу Сабаленку, ветэрану студэнцкага будаўнічага руху ГДУ, было аб чым успомніць у сваім выступленні перад сённяшнімі байцамі атрадаў, параўнаць іх працоўныя поспехі з тымі першымі, якіх дабіваліся яны, першапраходцы.

Шчырую падзяку за дасягненні байцоў Гомельскага дзяржаўнага універсітэта ў юбілейным працоўным семестры-83, за вялікую грамадска-палітычную работу, праведзеную зводным СБА ГДУ на месцах дыслакацыі выказаў на мітынгу камісар абласнога штаба СБА Анатоль Сенін.

Як эстафету працоўнай славы студэнцкіх будаўнічых атрадаў універсітэта майстар СБА «Волаты» фізічнага факультэта Віктар Кузьміч парадаваў сімвалічную кельму першакурсніку Сяргею Фядосенку:

— Працягвайце вы, наша змена, лепшыя працоўныя традыцыі ГДУ, памнажайце іх!

Мітынг студэнцкіх атрадаў закончыўся ўскладаннем кветак да помніка загінуўшым воінам ва універсітэцкім парку.

...Фінішаваў трэці працоўны семестр-83. Яшчэ адзін яркі радок запісаны ў біяграфію студэнцкага будаўнічага руху ГДУ.

**Т. ДУБЯК.**



**НА ЗДЫМКАХ: 1. Яны працавалі бортправадніцамі. 2. Уручэнне сімвалічнай кельмы.**

Фота **К. Дзмітэркі.**

*Табе, першакурснік*

# КЛОПАТЫ ПРАФСАЮЗА

Студэнцкая прафсаюзная арганізацыя ГДУ, якая аб'ядноўвае звыш 3 тысяч членаў прафсаюза, адыгрывае важную ролю ў сістэме вучэбна-выхаваўчай, працоўнай і маральнай загартоўкі будучых спецыялістаў.

У структуру студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі ўваходзяць 7 факультэцкіх і 149 групавых прафарганізацый.

Цэнтрам прафсаюзнай работы з'яўляюцца студэнцкія прафгрупы, якія непасрэдна падпарадкоўваюцца прафбюро факультэтаў. Сумесна з прафкомам прафбюро факультэтаў вырашаюць пытанні вучэбна - выхаваўчай, культурна-масавай, спартыўна-аздараўленчай, арганізацыйна-масавай, жыллёва-бытавой работы. Прафбюро факультэтаў таксама маюць права размяркоўваць пуцёўкі ў санаторый-прафілакторый універсітэта, матэрыяльную дапамогу малазабяспечаным студэнтам, месцы ў інтэрнаце.

Прафком студэнтаў ГДУ ўдзяляе асаблівую ўвагу ўмацаванню здароўя студэнцтва. Студэнты могуць стаць на чаргу для набыцця льготных пуцёвак для лячэння і адпачынку ў санаторыях рэспублікі, краіны.

Непасрэдным клопатам прафкома з'яўляецца работа клуба мастацкай самадзейнасці і спартыўнага клуба ГДУ, дзейнасць якіх накіравана на фарміраванне маральна-эстэтычных і фізічных якасцей будучых спецыялістаў. Пры клубах працуюць гурткі, ансамблі, секцыі, якія з радасцю прымуць і вас, дарагія першакурснікі.

Састаўной часткай дзейнасці прафкома з'яўляецца палітыка-выхаваўчая работа са студэнтамі ў інтэрнатах універсітэта, кіраўніцтва дзейнасцю студсаветаў. Спадзяемся, што першакурснікі таксама стануць актывістамі студэнцкіх саветаў у інтэрнатах.

У верасні — кастрычніку пройдуць справаздачы і выбары ў студэнцкай прафсаюзнай арганізацыі. Гэта адказная пара праверкі актыўнасці і баявітасці прафгруп. Прафком студэнтаў выказвае ўпэўненасць у тым, што першакурснікі, якія папоўняць прафсаюзную арганізацыю універсітэта, таксама будуць нашымі актыўнымі памочнікамі ў рашэнні пытанняў арганізацыі быту і адпачынку студэнцкай моладзі.

**Н. КОЛТЫШАВА,**
**старшыня прафкома студэнтаў ГДУ.**

*Нататкі аб летняй педагагічнай практыцы студэнтаў*

# ТАЯМНІЦЫ ПРАФЕСІЙНАГА МАЙСТЭРСТВА

Штогод піянерскімі важатымі і выхавацелямі загарадных піянерскіх лагераў працуюць звыш 200 студэнтаў гісторыка-філалагічнага і матэматычнага факультэтаў ГДУ. Многае павінны ведаць і ўмець практыканты, каб правільна арганізоўваць выхаваўчую работу з дзецьмі ў летні перыяд.

Асаблівае месца ў падрыхтоўцы студэнтаў да работы ў піянерскіх лагерах займае спецкурс «Тэарэтычныя і метадычныя асновы выхаваўчай работы ў піянерскім лагеры». Праграма спецкурса, распрацаваная кафедрай педагогікі і псіхалогіі, ахоплівае важнейшыя напрамкі выхаваўчай работы з дзецьмі ў летні перыяд. Характэрнай асаблівасцю спецкурса з'яўляецца тое, што чытанне лекцый і правядзенне практычных заняткаў ажыццяўляецца не толькі выкладчыкамі кафедры, але і метадыстамі Палаца піянераў. У гэтым навучальным годзе, напрыклад, у чытанні спецкурса прымалі ўдзел старшы метадыст Гомельскага Палаца піянераў Э. Н. Ракіцкая, метадысты М. П. Сусло і Л. С. Сыцько.

Надзвычай важную ролю ў сістэме падрыхтоўкі студэнтаў да летняй педагагічнай практыкі адыгрывае арганізацыя вучэбнага інструктыўна-метадычнага лагернага збору. Ён праводзіцца, як правіла, на базе аднаго з загарадных піянерскіх лагераў. Асаблівасць яго ў тым, што ён дазваляе практычна падрыхтаваць студэнтаў — будучых атрадных важатых — у максімальна набліжаных умовах работы піянерскіх лагераў. У такой абстаноўцы практыканты інтэнсіўна набываюць прафесіянальныя веды, адпрацоўваюць практычныя навыкі выхаваўчай работы. Вопыт паказвае, што лепш за ўсё авалодваць практычнымі ўменнямі і навыкамі на зборы ў ходзе спецыяльна арганізаваных вучэбных заняткаў - практыкумаў, а таксама ў працэсе ўдзелу студэнтаў у падрыхтоўцы і правядзенні розных выхаваўчых мерапрыемстваў, якія арганізуюцца з інструктыўна-вучэбнай мэтай. Вось чаму яшчэ, задоўга да лагернага збору выкладчыкі кафедры педагогікі сумесна з работнікамі Палаца піянераў складаюць падрабязную праграму правядзення практыкумаў і разнастайных масавых мерапрыемстваў на кожны дзень.

Як адзін з важных напрамкаў у працэсе арганізацыі летняй практыкі разглядаецца самастойная работа студэнтаў. На перыяд падрыхтоўкі студэнтаў да практыкі ў кабінеце педагогікі і пры бібліятэцы Палаца піянераў афармляюцца метадычныя куткі, дзе практыканты маюць магчымасць пазнаёміцца з навінкамі метадычнай літаратуры па пытаннях арганізацыі летняга адпачынку дзяцей, занатаваць ў свой сшытак сцэнарыі розных выхаваўчых мерапрыемстваў, тэксты песень, дэвізы атрадаў, жарты і г. д.

Такім чынам, у практыцы работы кафедры намецілася пэўная сістэма падрыхтоўкі студэнтаў да праходжання летняй педагагічнай практыкі. А наколькі яна дзейсная, мы прасачылі ў час работы некаторых студэнтаў гісторыка-філалагічнага факультэта ў піянерскім лагеры.

...Піянерскі лагер «Рамантыка». Тут праходзілі практыку 8 студэнтаў: А. Бабарыка, З. Фільчанка, С. Шанец і інш. Розныя па назве іх піянерскія атрады: «Гайдаравец», «Дружба», «Рытм», «Адважны». У кожным з іх — свая песня, свой дэвіз, розныя цікавыя справы. Але, бадай, найбольш запомніліся рабятам агульнадружынныя мерапрыемствы, якія рыхтавалі і арганізоўвалі іх важатыя. З вялікім задавальненнем удзельнічалі піянеры ў «Дні імяніннікa», «Вечары любімай паэзіі», ваенна-спартыўнай гульні «Зарніца». Надоўга застанецца ў памяці рабят і развітальны «Агеньчык дружбы», які праводзіўся разам з чэшскімі піянерамі, што адпачывалі ў «Рамантыку». Асабліва трэба адзначыць работу піянерскага атрада «Рытм», дзе важатай была студэнтка А. Бабарыка. Ён заняў першае месца ў аглядзе строю і песні, у конкурсе ваенна-патрыятычнай песні «Беражыце блакітны глобус», быў першым памочнікам савета дружыны ў арганізацыі і правядзенні «Дня здароўя», «Свята Нептуна». Уся работа з піянерамі, на думку начальніка лагера і старшай піянерважатай, праводзілася студэнтамі-практыкантамі метадычна правільна, падмацоўвалася творчасцю, ініцыятывай, актыўнасцю.

У піянерскім лагеры «Чайка» атраднымі важатымі былі студэнты беларускага аддзялення гістфіла Л. Хількевіч, Л. Певец, Л. Кавалевіч, А. Карлоўскі, Н. Грабко. Апошняя выконвала абавязкі старшай піянерважатай лагера. Мы гутарылі са студэнтамі аб ходзе педагагічнай практыкі, аналізавалі праведзеныя выхаваўчыя мерапрыемствы, прагледзелі дакументацыю. У піянерскім пакоі акуратна раскладзены папкі з планамі работы атрадаў, дзённікі, у якіх важатыя аналізуюць кожны дзень, намячаюць перспектывы далейшай дзейнасці. Прыцягваў ўвагу спецыяльны стэнд, дзе размешчаны малюнкі дзяцей. Тут праводзіўся конкурс малюнкаў на тэму «Хлеб — наша багацце». Побач — вырабы, зробленыя рукамі саміх піянераў. Гэта — вынікі конкурсу «Сваімі рукамі». Добрыя водзывы пачулі аб студэнтах-практыкантах ад начальніка лагера, настаўніцы СШ № 19 г. Гомеля Валянціны Іванаўны Суражскай.

...На галоўнай алеі піянерскага лагера «Алмаз» — маляўнічы фотастэнд «Жыццё нашага лагера». На здымках — і студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта ГДУ В. Кісялёў, важаты піянерскага атрада «Рытм» і Ю. Лаечка, важаты «Пунсовых ветразяў». У піянерскім пакоі мы вялі размову аб жыцці піянерскіх атрадаў, аб тым, якія прафесіянальныя навыкі набылі студэнты ў лагеры. Вялікую дапамогу ў рабоце аказваў практыкантам створаны ў лагеры метадычны куток, дзе сабраны распрацоўкі піянерскіх збораў, гутарак, ранішнікаў, дзіцячых свят, вусных часопісаў і г. д. Студэнты выказалі шчырую ўдзячнасць начальніку піянерскага лагера, выкладчыкам СШ № 13 г. Гомеля, якія працавалі тут выхавацелямі, за паўсядзённую дапамогу, падтрымку.

Хутка адбудзецца выніковая канферэнцыя па летняй педагагічнай практыцы. Чакаем ад студэнтаў цікавых выступленняў і прапаноў па ўдасканаленню зместу і арганізацыі летняй педагагічнай практыкі.

**В. ГОРЛЕНКА,**
**кіраўнік піянерскай практыкі, кандыдат педагагічных навук.**

